В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# Дзеепрыметнік як форма дзеяслова

| | | |
|---|---|---|
| **Агульнае значэнне** | Абазначае прымету ці ўласцівасць прадмета паводле дзеяння, якая праяўляецца ў часе: парыжэлая трава (трава, якая парыжэла, прымета паводле дзеяння) | |
| **Адказвае на пытанні** | **які? якая? якое? якія?** → парыжэлы куст, парыжэлая трава, парыжэлае поле, парыжэлыя лугі | |
| **Марфалагічныя прыметы** | **Агульныя** | |
| | **з дзеясловам** | **з прыметнікам** |
| | 1) трыванне (засеяны (зак.), ствараемы (незак.));<br>2) час (захапляючы (цяп. ч.), захапляўшы (пр. ч.));<br>3) стан (парыжэлы (незал.), наладжаны (зал.)) | род, лік, склон (дапасуецца да назоўніка) |
| **Сінтаксічная роля** | Азначэнне: У парыжэлай траве скачуць конікі (І. Навуменка).<br>Выказнік: Палонка лёдам моцна скута (Я. Колас). | |

! Дзеепрыметнік разам з паясняльнымі словамі ўтварае дзеепрыметнае словазлучэнне, якое ў сказе з'яўляецца адным членам сказа: А лес, асветлены і абагрэты сонцам, пазіраў зусім-такі весела (Я. Колас).



© ТДА «Аверсэв»

# Утварэнне дзеепрыметнікаў

| Незалежнага стану | |
|---|---|
| **цяперашняга часу** | **прошлага часу** |
| Аснова цяперашняга часу незакончанага трывання I спр. + -уч- (-юч-): пішуць + уч → пішучы, хвалююць + юч → хвалюючы; II спр. + -ач- (-яч-): дрыжаць + ач → дрыжачы, заходзяць + яч → заходзячы | Аснова інфінітыва непераходных дзеясловаў закончанага трывання + -л-: пацямнець + л → пацямнелы, заінець + л → заінелы. Аснова інфінітыва пераходных і некаторых непераходных дзеясловаў + -ш- (аснова на зычны) і -ўш- (аснова на галосны): прынесці + ш → прынёсшы, памаўчаць + ўш → памаўчаўшы |
| ! У сучаснай мове ўжыванне дзеепрыметнікаў цяперашняга часу з суфіксамі -уч- (-юч-), -ач- (-яч-) і прошлага часу з суфіксамі -ш-, -ўш- абмежавана | |
| **Залежнага стану** | |
| Аснова цяперашняга часу пераходных дзеясловаў незакончанага трывання I спр. + -ем-: ствараюць + ем → ствараемы; II спр. + -ім-: вывозяць + ім → вывозімы | Аснова інфінітыва пераходных дзеясловаў закончанага трывання + -н-, -ен-, -ан-, -т-: аснова на -а-, -я- + -н-: гадаваць + н → гадаваны, пасеяць + н → пасеяны; аснова на галосны і мяккі зычны + -ен-: прынесці + ен → прынесены; аснова на цвёрды зычны + -ан-: пастрыгчы + ан → пастрыжаны; аснова некаторых дзеясловаў на -а-, -е-, -і-, -ы-, -о-, -у- і суфікс -ну- + -т-: жаць + т → жаты, адзець + т → адзеты, шыць + т → шыты, раскалоць + т → расколаты, абуць + т → абуты, апрануць + т → апрануты |
| ! У сучаснай мове абмежаваны | |
| Калі дзеепрыметнікі страчваюць прыметы дзеяслова (трыванне, стан, час) і набываюць сталую прымету, яны пераходзяць у прыметнікі: вісячы замок, калючы вожык, квітнеючы сад, спелы яблык | |

© ТДА «Аверсэў»

## Поўная і кароткая формы дзеепрыметнікаў

Дзеепрыметнікі залежнага стану маюць поўную і кароткую формы.

| Прыметы | Поўная форма | Кароткая форма |
|---|---|---|
| Змяняюцца | па родах, ліках, склонах | па родах, ліках, не скланяюцца |
| Маюць канчаткі | **адз. л.**<br>м. р. -ы: асветлены<br>ж. р. -ая: асветленая<br>н. р. -ае: асветленае<br>**мн. л.**<br>-ыя: асветленыя | **адз. л.**<br>м. р. -□: асветлен□<br>ж. р. -а: асветлена<br>н. р. -а: асветлена<br>**мн. л.**<br>-ы: асветлены |

## Правапіс НЕ (НЯ) з дзеепрыметнікамі

| Разам | Асобна |
|---|---|
| 1. З поўнымі дзеепрыметнікамі, калі яны без не (ня) не ўжываюцца: невыдумны, нядошлы, нямоглы.<br>2. Калі няма залежных слоў і супрацьпастаўлення: незасеянае поле.<br>3. Калі ўжываюцца словы вельмі, надта, зусім, часткова, поўнасцю, надзвычай, выключна: надзвычай непрадуманае выступленне | 1. Калі пры дзеепрыметніку ёсць паясняльныя словы: не засеянае грэчкай поле.<br>2. Калі ёсць супрацьпастаўленне: не засеянае, а толькі пабаранаванае поле.<br>3. З кароткімі дзеепрыметнікамі: поле не засеяна. |

## Дзеепрыметны зварот

Поўны дзеепрыметнік + Залежнае слова

якімі? дзеепрым. словазл.

Над палямі, вымытымі летнімі дажджамі, засінела чыстае неба.

якімі?

Над вымытымі летнімі дажджамі палямі засінела чыстае неба.

дзеепрым. словазл.



© ТДА «Аверсэв»

**Знакі прыпынку**




# Марфалагічны разбор дзеепрыметніка

## Парадак разбору

1. Часціна мовы (асобная форма дзеяслова), ад якога дзеяслова ўтворана, агульнае значэнне.

2. Пачатковая форма.

3. Марфалагічныя прыметы:

а) нязменныя: стан, час, трыванне;

б) зменныя: поўная ці кароткая форма, склон (у поўнай формы), лік, род.

4. Сінтаксічная роля.

## Узор разбору

Па зямлі, вясной абуджанай, красавік ідзе з пралескамі (С. Шушкевіч).

(Па зямлі) *абуджанай* — дзеепрыметнік, абазначае прымету прадмета паводле дзеяння (зямля, якую абудзіла вясна).

Пачатковая форма *абуджаны*, залежны стан, прошлы час, закончанае трыванне, ужыты ў поўнай форме, месным склоне, адзіночным ліку, жаночым родзе.

У сказе ў структуры дзеепрыметнага словазлучэння з'яўляецца азначэннем.



© ТДА «Аверсэв»

# Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова

| | | |
|---|---|---|
| **Агульнае значэнне** | Абазначае дадатковае дзеянне пры асноўным дзеянні, выражаным дзеясловам-выказнікам: Сярпок скрыгоча прагавіта, жытцо згрызаючы сярдзіта. (Скрыгоча, калі згрызае жытцо) | |
| **Адказвае на пытанні** | што робячы? што рабіўшы? што зрабіўшы? як? калі? з якой мэтай? | |
| **Марфалагічныя прыметы** | **Агульныя** | |
| | **з дзеясловам** | **з прыслоўем** |
| | 1) трыванне (паглядзеўшы (зак.), гледзячы (незак.)); 2) пераходнасць — непераходнасць; 3) форма толькі незалежнага стану (чытаючы кнігу, Янка...); 4) зваротнасць — незваротнасць (мыючыся, бегаючы) | 1) не змяняецца; 2) у сказе прымыкае да дзеяслова |
| **Сінтаксічная роля** | Акалічнасць: Пагубляла, уцякаючы, лета ўборы (У. Дубоўка). Не зважаючы на блізкую восень, грэла і пякло сонца. | |

# Утварэнне дзеепрыслоўяў

| Незаконччанага трывання | Закончанага трывання |
|---|---|
| Аснова цяперашняга часу дзеясловаў незакончанага трывання: I спр. + -учы (-ючы): пішуць + учы → пішучы, гуляюць + ючы → гуляючы; II спр. + -ачы (-ячы): гавораць + ачы → гаворачы, носяць + ячы → носячы; **але:** баючыся, дрыжучы, крычучы, сплючы (II спр.) | Аснова інфінітыва (або прошлага часу) дзеясловаў закончанага трывання: аснова на галосны гук + -ўшы: павітаць + ўшы → павітаўшы; аснова на зычны гук + шы: памагчы + шы → памогшы, прынесці + шы → прынёсшы |



© ТДА «Аверсэв»

## Дзеепрыслоўны зварот

Дзеепрыслоўе + Залежнае словы

Саломку выгнуўшы дугою, звісае колас над зямлёю (Я. Колас).

Прасторы зямлі шырыліся, разгортваючы свае малюнкі-чары (Я. Колас).

Свяціліся, святкуючы свой час, лагоднае бабіна лета (Я. Сіпакоў).

## Правапіс НЕ з дзеепрыслоўямі

| Разам | Асобна |
|---|---|
| Калі без не не ўжываюцца: недамагаючы, непакоячыся, нервуючыся | Ва ўсіх іншых выпадках: не ведаючы, не спяшаючыся, не падумаўшы... |

## Марфалагічны разбор дзеепрыслоўя

### Парадак разбору

1. Часціна мовы (асобная форма дзеяслова). Агульнае значэнне.
2. Марфалагічныя прыметы: пачатковая форма, трыванне, стан (калі ёсць), пераходнае ці непераходнае, зваротнае ці незваротнае.
3. Сінтаксічная роля.

### Узор разбору

Адчуўшы цяпло, ажываюць шмат якія насякомыя.

*Адчуўшы* — дзеепрыслоўе, абазначае дадатковае дзеянне.
Пачатковая форма *адчуць*, закончанае трыванне, незалежны стан, пераходнае, незваротнае.
У сказе ў структуры дзеепрыслоўнага звароту з'яўляецца акалічнасцю.



© ТДА «Аверсэв»